УДК 821.161.3 У. Караткевіч

**ВОБРАЗЫ ШЛЯХТЫ Ў АПОВЕСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА “ЦЫГАНСКІ КАРОЛЬ”**

**IMAGES OF THE NOBILITY IN THE U. KARATKIEVICH’S STORY “THE GYPSY KING”**

М. Г. Ясінская
M. H. Yasinskaya
БДПУ (Мінск)

Разглядаюцца вобразы шляхты ў аповесці У. Караткевіча “Цыганскі кароль”. Даследуюцца адносіны паміж персанажамі.

У. Караткевіч; “Цыганскі кароль”; шляхта; Міхал Яноўскі; Якуб Знамяроўскі; медыкус.

The images of the nobility in U. Karatkievich’s story “The Gypsy King” are analysed. The relationships between the characters are explored.

U. Karatkievich; nobility; Michal Janouski; Jakub Znamiarouski; medicus.

У гісторыі нашай краіны ёсць вельмі шмат цікавых старонак, кожная з якіх чымсьці адметная. Бясконца можна пералічваць знакамітых дзеячаў і ўспамінаць пра падзеі, якія адбыліся на тэрыторыі Беларусі. Было цэлае саслоўе, якое пакінула значны след у гісторыі, – шляхта.

Шляхта (ад старажытнаням. slahta – ‘род’ ці ад ням. schlacht – ‘змаганне’) – прывілегіяванае саслоўе ў Вялікім Княстве Літоўскім ці, пасля Люблінскай уніі 1569 года, у Рэчы Паспалітай, а таксама ў некаторых іншых дзяржавах. Шляхта спачатку была толькі воінскім саслоўем, але стала выконваць важную ролю ў палітычным жыцці Рэчы Паспалітай, а з цягам часу зацвердзіла сваё права на выбарчую манархію. Цікава, што любы шляхціц, выбраны дэпутатам сойма ці сойміка, меў права Liberum Veto (‘забараняю’). Гэта права дазваляла любому дэпутату спыніць вырашэнне пытання ці ўвогуле працу сойма. Складаныя адносіны манархіі са шляхтай сталі адной з прычын падзелу Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі [1; 4].

Трэба адзначыць, што ў прадстаўнікоў гэтага саслоўя часта быў даволі запальлівы і ганарлівы нораў. Некаторыя шляхціцы акрамя нораву больш нічога і не мелі, так як былі бедныя. Калі хтосьці абражаў іх гонар, яны заўсёды хапаліся за шаблю.

Многія беларускія пісьменнікі выкарыстоўвалі вобраз шляхты ў сваіх творах, з розных бакоў раскрываючы асаблівасці яе жыцця (напрыклад, Адам Міцкевіч – “Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве”, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – “Пінская шляхта”, Ян Баршчэўскі – “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, інш.). Выключэннем не стаў і Уладзімір Караткевіч – у аповесці “Цыганскі кароль” ён яскрава паказаў норавы і звычаі гэтага цікавага саслоўя. Насуперак прынятым у савецкі час устаноўкам у шмат якіх творах мастак выказваў сімпатыі да лепшых прадстаўнікоў шляхты, ставіўся да іх як да важнай часткі беларускай нацыі.

У аповесці “Цыганскі кароль” ідзе гаворка пра шляхціца Міхала Яноўскага, сядзібу якога захапіў сусед. Малады чалавек вырашыў шукаць дапамогі ў свайго дзядзькі Якуба Знамяроўскага. Як выявілася, той з’яўляўся так званым цыганскім каралём. У 1779 годзе цыганы выкралі ў яго коней. Знамяроўскі гэта так не пакінуў, узяў з сабою дваіх сяброў і напаў на табар. Як кажуць, *“паб’еш чалавека – ён пачынае цябе баяцца”* [3, с. 85]. Праз некалькі дзён прыехалі цыганы з Лідскага павета і папрасілі Якуба прыняць іх да сябе. Хутка кароль Станіслаў-Аўгуст зацвердзіў Знамяроўскага цыганскі каралём Якубам Першым.

Вобраз Якуба Першага сімпатыі не выклікае: *“Ніводнай сівінкі ў патлах, нізкі лоб, шырокія грудзі, доўгія магутныя рукі, караткаватыя для тулава ногі, што моцна стаялі на зямлі. Кароткія вусы ўпрыгожвалі твар, трошкі пабіты воспай. І*

*гэты твар быў вельмі азызлы ў шчоках"* [3, с. 78]. Непрывабная знешнасць, тым не менш, не перашкодзіла яму стаць аўтарытэтным уладаром: у яго атрымлівалася трымаць цыганскую дзяржаву ў руках, амаль ніхто яму не пярэчыў.

Аднак была ў караля адна слабасць: ён вельмі любіў выпіць. Увогуле ўсе шляхціцы, якія яго акалялі, таксама не грэбавалі гэтай справай. Міхал Яноўскі быў вельмі здзіўлены, бо *"звык да штодзённай нормы ўжывання віна шляхецкай вялікай сям'ёй – дванаццаць бутэлек"* [3, с. 90]. У Знамяроўскага ж напіваліся да таго, *"што нейкі шляхцюк пачаў рагатаць, гледзячы на ўласны палец, а другі засяроджана браў з талеркі пірагі, выграбаў з іх пальцам начынку, а астатняе кідаў пад стол, дзе круціліся дацкія сабакі – п'яўкі"* [3, с. 90].

Медыкус Якуба Першага выказаў цікавую думку пра п'янства: *"…П'юць, каб забыць, каб пазбыцца жахаў, каб заліць гора і знішчыць няўпэўненасць. Але галоўным чынам, каб прыдбаць сяброў"* [3, с. 91]. І гэта сапраўды так, бо менавіта дзякуючы баляванням у цыганскага караля і атрымалася схіліць да сябе шляхту і яе шаблі. Толькі цікава: вось гэтай, заўсёды п'янай, шляхтай Якуб сам і пагарджаў. Ён добра бачыў, што саслоўе пачало гніць. *"Мерцвякі вы! Людзей вы толькі распінаеце! І я распінаю, і я б'ю… Хоць бы хто, хоць бы хто мне па мордзе даў у адказ… Шляхта! Соль зямлі! Гонар беларускі!"* [3, с. 110].

Тым не менш Знамяроўскі – надзвычай жорсткі, а месцамі бесчалавечны: без шкадавання карае сваіх падданых, не мае ні кроплі літасці нават да цяжарнай. Ён лічыць сябе вышэй за іншых і любіць, каб толькі яму было добра. Верыць, што ніколі, нават калі дзяржаву падзеляць, яму нічога не будзе пагражаць. *"Праўда, царыца дабіраецца і да яго зямлі, дзеліць Польшчу, але чорт яе бяры. Яму, Знамяроўскаму, і пры царыцы будзе не горш. А калі надта ўжо не спадабаюцца новыя парадачкі – можна разам з падданымі адкачаваць туды, дзе яшчэ будуць залатыя шляхецкія вольнасці. Ды не, не папусціць бог. Гэта ж такая сіла, шляхта! Хоць бы і ён нават?! А добры мой народ гэтаму дапаможа"* [3, с. 91].

Якуб Знамяроўскі – вельмі харызматычны чалавек. Сваімі палкімі прамовамі ён з лёгкасцю змог пераканаць людзёй дапамагчы Міхалу вызваліць сядзібу. Але ёсць у гэтым нешта не тое, нешта дзікаватае. Цяжка зразумець, чаму адзін шляхціц мог свабодна нападаць на іншага шляхціца. Пераможцам выходзіў мацнейшы, а ўлада на гэта амаль ніяк не рэагавала. Медыкус на гэты конт кажа: *"…Мы цяпер, літасцю нашай шляхты і добранькага пана бога, зрабіліся такім народам, што ў нас цыганскае каралеўства – вялікая дзяржава, а бойка на палявой мяжы – знешняя палітыка..."* [3, с. 85].

Разам з тым кароль нікому не саступаў у мужнасці і адвазе. Калі цыганы вырашылі яго звергнуць, толькі ён і Яноўскі змагаліся, усе астатнія паўцякалі.

Але ўсё ж такі засталася шляхта, якая не дэградавала, не страціла годнасць. Яна прадстаўлена ў вобразе Міхала Яноўскага. Ён быў яшчэ малады і, магчыма, таму шчыра верыў у магутнасць свайго саслоўя. Калі медыкус расказваў пра сапраўднае становішча шляхты, ён вельмі злаваўся і хапаўся за шаблю. І гэта зразумела, бо, як сапраўдны шляхціц, Міхал хацеў абараніць свой гонар.

З цягам часу, знаходзячыся ў цыганскім каралеўстве і назіраючы за паводзінамі Якуба і яго акружэння, Яноўскі мяняе сваё меркаванне. Маладому чалавеку абрыдлі пастаянныя п'янкі, а на медыкуса ён ужо больш не сярдуе, калі той кажа нешта дрэннае пра шляхту. *"Яноўскі слухаў яго з дзіўным спакоем. Нібы не яго любую, моцную, вольную дзяржаву лаялі. Нібы зусім не шляхціц ён, а самы звычайны лапаць. Міхал па-ранейшаму пагарджаў мужыкамі, але і шляхту не мог любіць – наглядзеўся за гэтыя дні. І гэта было рыцарства, надзея Беларусі, яе*

*блакітная кроў. Паганцы!"* [3, с. 106]. Аднойчы ён нават выратаваў звычайную сялянскую дзяўчыну Аглаю, да якой прыставаў п'яны шляхціц.

Але поўны перагляд ранейшага жыцця адбыўся ў Яноўскага, калі цыганы напалі на Знамяроўскага. Смелы малады чалавек адразу вырашыў абараняцца. Ён сам пастроіў шляхту. *"Сэрца Яноўскага палала нябесным ярасным захапленнем. Не, жывая была адвага сотні пакаленняў, жывая была слава! Вось яна, сонная, ля віннай бочкі, убачыла небяспеку, разгарнула крылы і ляціць над галовамі людзей"* [3, с. 115]. Ды толькі атрымалася так, што, калі Міхал рынуўся на цыганоў, астатняя шляхта пахавалася. Хлопца схапілі, звязалі і хацелі забіць, але яго выратавала Аглая, якой калісьці ён дапамог. У яе атрымалася запэўніць цыганоў і мужыкоў памілаваць яго. Простая дзяўчына выратавала душу Яноўскага, бо пасля таго, як усе яго ідэалы, звязаныя са шляхтай, разбіліся, яму было вельмі дрэнна. *"Дзе ён, куды яны зніклі? Чаму ён такі вольны і спакойны? Кахаць – гэта так. Жыць, толькі жыць. Вось яна, сіла зямлі, улілася ў яго праз гэтую, якую ён яшчэ не ведаў некалькі дзён таму. Зноў ад яе? Зноў піць, біцца на шаблях, зноў… Ах толькі не гэта!"* [3, с. 119]. Міхал і Аглая пажаніліся. Пасля смерці бацькоў ён распусціў прыгонных сялян. Жылі яны небагата, але вельмі шчасліва.

Паказальна, што Знамяроўскі зусім не зразумеў, чаму яго пляменнік узяў сабе жонку з прыгонных. *"Хворы чалаве. Безнадзейна хворы… Толькі дрэнна гэта. Куды падзенецца яго рыцарскі дух? Эх, было два нас на свеце, цяпер адзін я застануся. Загінула радзіма!"* [3, с. 126]. Але, думаецца, гэта не так: менавіта пакуль ёсць такія – справядлівыя, смелыя, прагрэсіўныя – людзі, як Міхал, наша радзіма будзе жыць.

Варта асобна звярнуць увагу на яшчэ адзін цікавы персанаж – медыкуса Якуба Знамяроўскага. Яго імя аўтар не называе. Пра сябе герой паведаміў, што калісьці яго *"засудзілі на баніцыю, бо даставаў з магіл трупы і рабіў забароненае анатаміраванне іх"* [3, с. 82]. Калісьці медыкус таксама быў шляхціцам, ды толькі цяпер ён пагарджае гэтым тытулам, паколькі бачыць, што сталася з саслоўем.

Мінулае лекара трагічнае: два самыя дарагія чалавекі памерлі з голаду, калі ён сядзеў у клетцы ў Нясвіжы. Магчыма, з-за гэтага ў ім нешта зламалася, перамянілася. Менавіта тады ён і пачаў хаваць сваё імя, фактычна адмовіўшыся ад шляхецкага звання. *"І няхай яны здыхаюць цяпер, бо гэта я, я, чалавек, пра імя якога ніхто ніколі не даведаецца, першы на свеце ачысціў мозг ад кавалкаў раструшчанай чарапной косці і наклаў на дзірку ў чэрапе лапік з залатой пласцінкі. І гэты чалавек застаўся жыць"* [3, с. 83].

Медыкус шчыра палюбіў Міхала, а таму спрабаваў адкрыць яму вочы на становішча шляхты і краіны. Увогуле гэты чалавек вельмі разумны і міласэрны (ён адзіным, хто вырашыў дапамагчы цяжарнай). Медыкус любіць сваю радзіму і мову і добра разумее, што *"аснова ўсяму – мужык"* [3, с. 87]. Даследчык А. Верабей не без падстаў называе яго alter ego пісьменніка: "Выказванні медыкуса <…> прасякнуты трывогай і болем за родны край, напоўнены шматзначным сэнсам" [2, с. 366].

У канцы аповесці лекар даведваецца, што ў Еўропе пачынаюцца хваляванні, і вырашае ехаць туды. Далейшы яго лёс дакладна невядомы, але кажуць, што *"ў славутым Канвенце адным з дэпутатаў, выбраных за заслугі перад рэвалюцыяй, быў чужак, грамадзянін з невядомай краіны, што звалася па-латыні Alba Russia. Некаторыя сцвярджалі, што па прафесіі ён лекар, як Марат. Ён гэта быў ці не ён – невядома… У страшны дзень, калі Рабасп'ер раздрабіў сабе сківіцу стрэлам з пулгака, гэты чалавек – адзін з нямногіх – да канца абараняў яго і склаў галаву на славутай машыне доктара Гільятэна…"* [3, с. 129].

Слаўны медыкус усё жыццё прысвяціў служэнню людзям, спачатку як добры лекар, а затым – як няспынны змагар за свабоду. Менавіта такія асобы заўсёды будуць абараняць праўду і выступаць за высокія ідэалы.

Такім чынам, У. Караткевіч у аповесці “Цыганскі кароль” стварыў панараму жыцця беларускай шляхты ў XVIII стагоддзі, паказаў выраджэнне калісьці слаўнага і велічнага саслоўя, аднак праз вобраз Міхала Яноўскага пакінуў надзею на захаванне даўніх шляхецкіх якасцей – гонару, годнасці і сумлення.

Літаратура


1. Белорусская шляхта ВКЛ [Электронный ресурс] // Краткая история Беларуси за последнюю 1000 лет. – Режим доступа: http://history-belarus.by/pages/terms/shliahta.php. – Дата доступа: 13.01.2021.
2. Верабей, А. Л. Уладзімір Караткевіч / А. Л. Верабей // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 4 : 1966–1985. – 2002. – С. 361–390.
3. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987–1990. – Т. 2 : Аповесці, апавяданні, казкі. – 1988. – 511 с.
4. Шляхта [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабодная энцыклыпедыя. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%A8%D0%BB%D1%8F%D1%85%D1%82%D0%B. – Дата доступу: 13.01.2021.